## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ПРАГРАМА
## кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь
## Віталя Рымашэўскага

# ХРЫСЦІЯНСКАЯ БЕЛАРУСЬ — СПРАВЯДЛІВАЯ ЎЛАДА!

*Віталь Рымашэўскі — кандыдат ад Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, новай палітычнай сілы, якая ствараецца ў Беларусі.*

*Аргкамітэт Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі (БХД) аб'ядноўвае ўсіх тых, хто гатовы будаваць Беларусь на аснове хрысціянскіх каштоўнасцей і патрыятызму.*

*За аснову нашай эканомікі, палітыкі, сацыяльнага жыцця мы бярэм хрысціянскія прынцыпы. Яны ўсім даўно вядомыя — не забівай, не крадзі, не хлусі, паважай сваіх бацькоў, паважай жыццё і маёмасць іншага чалавека.*



### 1. БЕЛАРУСІ — СУМЛЕННУЮ ПАЛІТЫКУ

Галоўнае, што людзям трэба ад улады — сумленнасць. Хлусіш, не выконваеш абяцанняў — у адстаўку. Крадзеш — у турму. Вышэйшы начальнік — значыць, большая адказнасць.

Хрысціянская дэмакратыя верне законнасць у суды, пракуратуру, міліцыю. Хрысціянская дэмакратыя разгроміць бюракратыю: інтарэсы чалавека будуць вышэй за інтарэсы чыноўнікаў.

Мы кампенсуем уклады, якія людзі страцілі з развалам Савецкага Саюза.

#### Адукацыя

Вернем ільготы беларускім студэнтам. Вернем бясплатную адукацыю для ўсіх.

Адменім сучаснае «прыгоннае права» ў Беларусі — прымусовае размеркаванне.

Адменім кантрактную сістэму ў адносінах да настаўнікаў. Сярэдні заробак настаўнікаў да ўзроўню сярэдняга заробку ў дзяржаўных установах.

#### Медыцына

Зараз з нашых падаткаў грошы ідуць на ўтрыманне бюракратычнай медыцынскай сістэмы. Пры гэтым кажуць, што медыцына ў нас бясплатная.

Мы спынім фінансаванне бюракратаў.

Грошы за лячэнне будуць пералічвацца непасрэдна дактарам, а не праз сістэму аховы здароўя, дзе на дадзены момант ільвіная доля сродкаў раскрадаецца.

#### Пенсіі

Нямецкія пенсіянеры атрымліваюць пенсіі, на якія могуць падарожнічаць па ўсім свеце!

А нашыя бацькі вымушаныя працаваць пасля выхаду на пенсію, каб хоць неяк дапамагчы сваім дзецям, пражыць самім.

Мы павысім пенсіі да еўрапейскага ўзроўню, дастаткова аддаць па 20% акцый вядучых прадпрыемстваў Беларусі («Беларуськалій», нафтаперапрацоўчыя заводы) у Пенсійны фонд.

#### Войска

Беларускае войска будзе мабільным і прафесійным. Замест прымусовага прызыву — вайсковыя зборы ад 3 да 6 месяцаў. Вайскоўцам гарантуем службовае жытло з правам прыватызацыі, вернем ільготы і пенсію пасля 20 гадоў выслугі.

#### Чарнобыль

Беларускія ўлады на працягу 16 гадоў труцяць беларусаў радыяцыяй. Радыеактыўныя прадукты з забруджаных зон трапляюць у крамы ЎСІХ гарадоў Беларусі. Перавышэнне доз радыяцыі ёсць у кожнага трэцяга жыхара Мінска (у Бабруйску і Горках — двух з трох і г.д.). Людзі хварэюць і паміраюць. Улада хавае статыстыку і маўчыць.

Ліквідатарам чарнобыльскай катастрофы вернем ільготы.

Адновім эфектыўную сістэму радыяцыйнага кантролю прадуктаў харчавання па ўсёй Беларусі, у тым ліку ў горадзе Мінску.

Спынім вытворчасць прадуктаў харчавання на забруджаных тэрыторыях, спынім выкарыстанне адчуджаных забруджаных земляў.

Арганізуем вытворчасць прэпаратаў, якія блакуюць радыенукліды і паскараюць іх вывад з арганізма. Забяспечым усе медыцынскія ўстановы і аптэкі на тэрыторыі краіны гэтымі прэпаратамі.

### 2. ЗА БЕЛАРУСЬ БЕЗ КАРУПЦЫІ!

Адкуль узяць на рэформы грошы? Усё проста — выкараніць карупцыю. І не падманваць замежных інвестараў. Тады грошы прыйдуць у Беларусь.

Мы, беларускія хрысціянскія дэмакраты, вырашым праблему карупцыі радыкальна: паменшым колькасць чыноўнікаў у 3 разы. Менш чыноўнікаў — менш карупцыі! Мы прымем «Закон Лінкальна», які дзейнічае ў многіх развітых дэмакратычных краінах: той, хто дакажа факт карупцыі, атрымае 25% ад выяўленага.

Мы не дапусцім раскрадання агульнанароднай маёмасці: ніякай «прыхватызацыі»!

Законна набытая прыватная ўласнасць будзе недатыкальнай.

#### Суды

Зробім незалежнымі ад улады суды і адвакатуру. Незалежныя суды — гарантыя роўнасці перад законам для ўсіх. Кожны пацярпелы мае права на кампенсацыю з боку злачынцы нанесенай яму шкоды ў памеры, які яго задаволіць, з наступным прымірэннем бакоў і вызваленнем таго, хто пакаяўся, ад пазбаўлення волі.

#### Міліцыя

Праваахоўныя органы і міліцыя будуць пазбаўлены ад умяшальніцтва ў іх прафесійныя справы з боку ўлады і спецслужбаў. Ніхто не будзе замінаць працы міліцыі.

Афіцэры міліцыі, якія бароняць нас ад бандытызму, будуць бесперашкодна спаўняць свае абавязкі. А «пярэваратні ў пагонах» будуць сядзець у турме.

#### Турма

У Беларусі людзей садзяць у турму за дробныя парушэнні закону. А тыя, хто крадзе мільёны — на свабодзе. Турма павінна выпраўляць чалавека, а не калечыць.

### 3. БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНАЕ САМАКІРАВАННЕ!

Дыктатура і карупцыя будуць разбураныя, калі ў Беларусі будзе сапраўднае мясцовае самакіраванне.

Мэры гарадоў, мястэчак і нават вёсак будуць выбірацца людзьмі, а не прызначацца. Мы правядзем выбары ўсіх узроўняў без фальсіфікацый.

Уладу — людзям, якія жывуць тут, а не раённай ці абласной мафіі!

З мэтай скарачэння дзяржаўных выдаткаў і павышэння эфектыўнасці кіравання мы, беларускія хрысціянскія дэмакраты, правядзем адміністрацыйную рэформу.

Будзе скасаваны цяперашні адміністрацыйны падзел Беларусі на 118 раёнаў, 6 абласцей і г. Мінск. Мэтазгодна ўвесці адміністрацыйны падзел на 23 рэгіёны. Тым самым будзе скарочана колькасць бюракратычных узроўняў — замест 6 абласных і 118 раённых дзяржаўна-бюракратычных будзе 23 каманды прафесіяналаў. Такім шляхам мы знізім выдаткі на ўтрыманне чыноўнікаў, якіх стане ў разы менш, і павысім якасць кіравання дзяржавай з перадачай істотных паўнамоцтваў у рэгіёны. Рэгіянальнымі цэнтрамі стануць: Брэст, Кобрын, Пінск, Жыткавічы, Мазыр, Рэчыца, Гомель, Крычаў, Бабруйск, Магілёў, Орша, Віцебск, Полацк, Глыбокае, Барысаў, Мінск, Маладзечна, Ліда, Гродна, Смаргонь, Баранавічы, Слуцк, Ваўкавыск.

1/3 ад усіх падаткаў, сабраных на месцах, павінна заставацца ў мясцовым бюджэце — адпаведна, мясцовым Радам павінна быць перададзеная значная частка ўсіх паўнамоцтваў.

### 4. БЕЛАРУСЬ — ГЭТА СВАБОДА

Кожнаму чалавеку і народу свабода дадзеная Богам. «Дзе Дух Гасподні — там свабода» (2 Карынф 3:17). Але свабода — не ўседазволенасць. Свабода — вольны выбар і адказнасць за яго. Хрысціянскія дэмакраты — за свабоду ад страху, хлусні і зла.

Найперш, мы забяспечым поўную свабоду веры.

Вернем цэрквам іх маёмасць, а сённяшнім уладальнікам кампенсуем страты па прымальным кошце.

У занядбаных вёсках і на гарадскіх ускраінах перададзім пустуючыя будынкі хрысціянскім арганізацыям для наладжвання хоспісаў, сталовых, нядзельных школаў і місіянерскіх цэнтраў.

Свабода СМІ ў нашым разуменні — гэта адмена палітычнай цэнзуры. Мы спросцім парадак рэгістрацыі СМІ і будзем заахвочваць стварэнне газет, сайтаў і тэлеканалаў у невялікіх гарадах, мястэчках і нават вёсках.

### 5. БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ ЗАМОЖНАЙ КРАІНАЙ

Вольны, дробны і сярэдні бізнес — аснова нацыянальнай эканомікі. Заснаваць сваю справу можна будзе на працягу аднаго дня.

Пры хрысціянскіх дэмакратах беларуская эканоміка будзе справядлівай: рынкавай, але сацыяльна арыентаванай. Максімальна спросцім падаткаабкладанне: кожны беларус зможа сам, без бухгалтарскай адукацыі, лічыць свае падаткі.

Падатковая інспекцыя дзейнічае як рэпрэсіўная машына. Мы гэта спынім!

Мы спынім абкраданне беларускіх грамадзян. Адменім мыты на аўтамабілі з Еўропы!

Крэдыты ў Беларусі будуць не болей за 3%. Такія крэдыты ў Еўропе. Лукашэнка бярэ еўрапейскія крэдыты па такіх працэнтах і прадае народу па 14-17%. Вось так улада турбуецца пра беларусаў!

Асновай беларускай эканомікі павінны быць высокія даходы тых людзей, хто працуе. Большасць беларускіх прадпрыемстваў нерэнтабельныя, бо людзі не маюць кантролю за кіраўніцтвам прадпрыемства.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты адменяць кантрактную сістэму.

Мы створым свабодныя прафсаюзы, дадзім магчымасць кантраляваць, куды ідуць зробленыя прадпрыемствам грошы.

Мы ўвядзем прыватную ўласнасць на зямлю. Сярэдні клас стане апорай моцнага грамадства, здольнага адстойваць свае правы.

#### Кошты на бензін

Беларусь атрымлівае нафту для ўнутранага спажывання па ўнутрырасійскіх коштах, а бензін значна даражэйшы. Мы знізім кошты на паліва для беларусаў.

#### Кошты на кватэры

У большасці гарадоў неапраўдана завышаныя кошты на жыллё, на коштах мінскіх кватэр нажываецца Лужкоў і іншыя алігархі. Мы спынім карупцыйныя схемы, увядзем іпатэку.

#### Сельская гаспадарка

Мы ўвядзем прыватную ўласнасць на зямлю: зямля павінна належаць гаспадару! Беларускія хрысціянскія дэмакраты зробяць сельскую гаспадарку сучаснай, заснаванай на найноўшых біятэхналогіях.

### 6. БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАПЕЙСКАЯ КРАІНА

Мы ўсталюем узаемавыгадныя сяброўскія дачыненні з Еўропай і Расіяй. Перакосы ў палітычных і гаспадарчых стасунках будуць выпраўленыя.

Беларусь — нейтральная краіна. БХД гарантуе без'ядзерны статус Беларусі і няўдзел Беларусі ў вайсковых канфліктах за межамі краіны.

Беларусы змогуць без віз наведваць еўрапейскія краіны.

БХД збудуе ў Беларусі сапраўдную еўрапейскую эканоміку, заснаваную на навука- і працаёмістай вытворчасці, транзіце, сэрвісе, турыстычным бізнесе, інфармацыйных і экалагічных тэхналогіях.

Беларусь, якая размяшчаецца ў самым сэрцы Еўропы, бачыцца нам як высокаразвіты сэрвісны, фінансавы, тэхнічны, навуковы і інфармацыйны цэнтр сусветнага ўзроўню на ключавым геапалітычным скрыжаванні.

### 7. УСЯ МОЦ ДЗЯРЖАВЫ — НА ПАДТРЫМКУ СЯМ'І

Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя скіруе дзяржаўныя рэсурсы на падтрымку беларускіх сем'яў.

Мы прымем дзяржаўныя праграмы змяншэння колькасці абортаў і разводаў. Спыніць выміранне нацыі і спрыяць умацаванню сем'яў — задача для сапраўды народнай партыі, якой з'яўляецца БХД.

Дапамога па доглядзе за дзіцём будзе ў памеры сярэдняга заробку на кожнае дзіця да 5 год і паловы сярэдняга заробку на дзіця да 10 год.

БХД гарантуе крэдыты на жыллё і набыццё маёмасці маладым сем'ям. Сямейнаму бізнесу — падтрымку!

Мы ўвядзем у дзеянне комплекс мерапрыемстваў па змаганні з усеагульнай алкагалізацыяй. Паставім заслону спойванню беларусаў няякасным «чарнілам».

Вынесем гульнявыя зоны і казіно за тэрыторыі населеных пунктаў. Спынім прапаганду разбэшчанасці.

**Разам мы пераможам!**

Мы заклікаем вас адстаяць свабоду і справядлівасць Беларусі.

Як кажуць хрысціянскія дэмакраты: Жыве Беларусь — Жыве з Богам!

## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ПРАГРАМА
## кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь
## Віктара Цярэшчанкі

# ПРАБЛЕМЫ КРАІНЫ, ІХ ПРЫЧЫНЫ І ШЛЯХІ ВЫРАШЭННЯ

Паважаныя выбаршчыкі!

Я кандыдат эканамічных навук, дацэнт па спецыяльнасці «эканоміка». Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XIII склікання. Маю вопыт работы ў сферах дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання.

Жанаты. У мяне тры дачкі і ўнучка. Бацька і маці беларусы, ветэраны вайны і працы.

Я ведаю патрэбы і праблемы людзей і бачу шлях выхаду краіны з крызісу.

Дзеля таго, каб надзеі кожнага на лепшае жыццё, добры дом, моцную сям'ю, дабрабыт дзяцей сталі рэальнасцю, я гадамі распрацоўваў гэтую Праграму, вывучаў айчынны і сусветны вопыт. Знайдзіце час унікнуць у мае прапановы. **У іх — ключ да дабрабыту краіны, сям'і і кожнага чалавека!**



Што сёння трывожыць людзей?

У першую чаргу — рост цэн. За 16 гадоў з часу выбрання Прэзідэнта цэны на прадукты з улікам грашовых дэнамінацый выраслі ў тысячы разоў! Зарплаты, пенсіі, стыпендыі, дапамогі адстаюць ад росту цэн. І кожны разумее, што пасля выбараў рост цэн пойдзе яшчэ хутчэй.

**Чаму вырабляем больш, а маем менш? Куды ўсё дзяваецца?**

Справа ў тым, што наш рубель увесь час таннее. За 16 гадоў ён абясцэніўся да долара **ў 4 тысячы разоў!** Таму ў краіне людзі, прадпрыемствы, банкі купляюць і назапашваюць долары і еўра. Але і гэтыя грошы абясцэньваюцца. За тыя ж 16 гадоў долар стаў танней да золата **ў 4 разы!** Скупляючы і захоўваючы валюту, мы працуем на сусветных банкіраў.

**Наш рубель не валюта.** Па сутнасці, у краіне няма нацыянальных грошай.

**Зніжаецца канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі. Нашы вытворцы** бяруць крэдыты ў банках. У той час як замежныя канкурэнты даўно працуюць па іншай фінансавай схеме. Як акцыянерныя таварыствы, развіваюцца за кошт інвестыцый у абмен на акцыі.

**Дырэктары і кіраўнікі вертыкалі!** Пралічыце вашы закрэдытаваныя бізнэс-планы па варыянце прамых інвестыцый. Вы пераканаецеся, што фінансавая затратнасць нашых прадпрыемстваў у 2 разы вышэй, чым у канкурэнтаў. Паколькі ўключае пагашэнне крэдытаў і «дзікія» працэнты. Канкурэнтныя цэны мы трымаем нізкай зарплатай рабочых.

**Урад не бачыць уласных крыніц інвестыцый.** Нашы банкі адны з самых дробных у свеце. Нашы станкі, машыны, абсталяванне зношаныя. Але гэта не віна дырэктараў, банкіраў. Гэта наступства памылак у грашова-крэдытнай палітыцы краіны.

**Грубая памылка і ў падатковай сістэме.** Ва Урадзе не разумеюць, што галоўны прынцып падатковай сістэмы канкурэнтаў — спачатку не перашкаджаць вытворцу выпусціць і прадаць прадукцыю, а ўжо потым — узяць падаткі з прыбытку.

У Беларусі падаткі ўключаюць у цану прадукцыі, як затраты і надбаўкі да іх. Каб выканаць прагнозы, прадаём са стратамі. Страты маскіруюцца ва ўліку пераацэнкамі маёмасці і «затратамі будучых перыядаў».

У краіне ідзе барацьба з бюракратызмам і карупцыяй. Але яны не знікаюць, як вынік самой Сістэмы. У ёй кожны «князь»-чыноўнік прэзідэнцкай вертыкалі — яе закладнік і бясправўны чалавек. Каб утрымацца, ён павінен дагаджаць свайму начальніку. Інакш не пракорміць сям'ю.

Дабівацца росту даходаў, прыбытку і легальнай зарплаты на нашых прадпрыемствах — нявыгадна. Усе матывацыі для наёмных работнікаў **у такой сістэме** — працаваць менш, але больш атрымліваць і не плаціць падаткі. Таму Сістэма вымушаная жорстка кантраляваць і прымушаць людзей працаваць.

Любога кіраўніка на любым прадпрыемстве заўсёды можна ў чымсьці абвінаваціць. Кантракт яго не абараняе. І суд не апраўдае. Бо суддзі таксама закладнікі Сістэмы. Іх прызначае і вызваляе галоўны «ўласнік краіны» — Прэзідэнт.

Сёння ўлада бачыць выратаванне ў прыцягненні замежнага капіталу. **Гэта стратэгія адсталых дзяржаў,** навязаная міжнародным капіталам, які размяшчае экалагічна небяспечныя вытворчасці на чужых тэрыторыях. На такіх тэрыторыях народу адводзіцца роля толькі рабсілы і канкурэнта мігрантам у краіну. Калі Беларусь пойдзе па гэтым шляху, то мы атрымаем міжрэлігійныя і этнічныя праблемы, якія цяпер трасуць краіны Еўропы, ЗША і ўвесь свет.

**Я ПРАПАНУЮ:**

**1. Незалежнасць краіны ад замежнай валюты.** Мы зможам самі даваць крэдыты і грашовыя інвестыцыі іншым краінам.

Тлумачу, як гэта зробім.

Забяспечым нашы грошы нацыянальнай маёмасцю. Увядзём рубель свабоднаканвертуемым з пачатковым курсам 3 рублі за 1 долар.

Адначасова з гэтым усе эканамічна абгрунтаваныя праекты нацыянальных прадпрыемстваў атрымаюць права **на дзяржаўныя інвестыцыі** за кошт продажу сваіх акцый дзяржаве. Такая схема фінансавання разам са змяненнем падаткаў і спрашчэннем уліку рэзка павысіць канкурэнтаздольнасць тавараў, работ і паслуг.

Гэта актывізуе нашу эканоміку на нацыянальнай грашовай аснове. Экспарт стане даходным. Акцыі прадпрыемстваў (а не віртуальная валюта замежных дзяржаў і не золата, якое змярцвляе рэсурсы), стануць забеспячэннем нацыянальных грошай. Акцыі эфектыўных прадпрыемстваў — гэта актывы, лепшыя за золата!

Эканоміку краіны напоўніць моцная нацыянальная валюта. Беларускія банкі стануць хутка расці. Крэдыты будуць даступнымі для ўсіх, як у развітых краінах (2—3% гадавых). Прадаваць свае акцыі дзяржаве або крэдытавацца ў банках — гэта будзе свабодны выбар прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў.

Кіраваць прадпрыемствамі ў краіне будзе не Прэзідэнт, а кампетэнтныя спецыялісты і дырэктары прадпрыемстваў, падкантрольныя сваім праўленням, працоўным калектывам і заканадаўству. Акцыі будуць прадавацца работнікам, банкам, грамадзянам, а таксама іншаземцам, але за нашу валюту.

Продажам акцый будуць забірацца адпаведныя сумы грошай з абарачэння і павышацца курс рубля.

Такім чынам, за 5—7 гадоў, а то і раней, выйдзем да долара — адзін да аднаго. Гэтым спынім рост цэн. А зарплаты, пенсіі, стыпендыі і дапамогі будуць расці ў нашай дзяржаўнай валюце. І дасягнуць еўрапейскага ўзроўню.

**2. Асноўнай крыніцай для бюджэту стануць даходы ад дзяржінвестыцый.**

Падаткі будуць выплачвацца, у асноўным, з прыбытку і стануць зніжацца.

Падаткі будуць дакладна абгрунтаваныя. Іх роля стане рэгулюючай. Сама сістэма падаткаабкладання, а не льготы для выбраных, стане стымуляваць вытворчасць.

**3. Створым умовы высокіх матывацый у вытворчасці.** Мы адновім права работнікаў на ўдзел у даходах прадпрыемстваў. Кожны работнік — ад радавога да кіраўніка — зможа зарабляць акцыі прадпрыемства, якія будуць налічвацца **ў дадатак да зарплаты.** Развіваць вытворчасць, укладваць у яго накапленні для кожнага работніка стане больш выгадна, даходна, чым захоўваць грошы дома або на банкаўскіх укладах. Пры жаданні кожны член працоўнага калектыву зможа і дадаткова набываць акцыі свайго прадпрыемства.

**4. На сяле і ў сельскай гаспадарцы** будзе працягнута палітыка дзяржавы. Больш за тое, будзе праведзена спісанне з сельгасвытворцаў (уключаючы фермераў) усіх даўгоў па падатках і штрафах. Разаўём сістэму гарантаванага дзяржзаказу на сельгаспрадукцыю. У сяла «адкрыецца дыханне» для эфектыўнай працы ў новай падатковай сістэме, дзе выплаты будуць з прыбытку. Даходы на сяле будуць не ніжэй за ўзровень даходаў гараджан.

**5. Падымем прэстыж беларускай навукі і інжынернай школы,** аплату працы навукоўцаў і навукова-педагагічных работнікаў, настаўнікаў, работнікаў культуры, мастацтва, дашкольных устаноў, урачоў і малодшага медперсаналу.

**6. Адновім права індывідуальных прадпрымальнікаў** па найме работнікаў з захаваннем заканадаўства аб працы. Улічым Нацыянальную Платформу бізнэсу Беларусі і Канцэпцыю комплекснай мадэрнізацыі краіны, распрацаваныя Рэспубліканскай канфедэрацыяй прадпрымальніцтва.

**7. Мы не будзем павышаць пенсійны ўзрост.** Але для тых, хто ХОЧА працаваць, дадзім ПРАВА выхаду на пенсію па іх жаданні пазней. Увядзём забарону звальняць работніка на пенсію без яго згоды. **Гэта вялізны рэсурс для краіны!** Працоўныя кантракты для рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў будуць неадкладна адмененыя.

**Усе гэтыя меры** раскрыюць патэнцыял людзей і эканомікі. Мы разам, без страху, надрываў і гвалту, спакойна, з павагай адно да аднаго, падымем вытворчасць і ўмацуем нашу дзяржаву.

Аздараўленне эканомікі дасць крыніцы для гарантаванага выканання ўсіх намечаных рашэнняў дзяржавы ў пытаннях росту зарплаты, пенсій, стыпендый, дапамог.

**За кошт эканамічнага росту забяспечым вырашэнне і новых задач у сацыяльнай сферы.** У тым ліку дадаткова павысім выплаты адзінокім маці, шматдзетным, маламаёмным, інвалідам. Палепшым сістэму адрасных датацый сем'ям з нізкімі даходамі. Для моладзі — бясплатная першая вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя. Іншагароднім студэнтам — інтэрнат або кампенсацыю паловы выдаткаў на арэнду пакоя. Кожнаму студэнту вочнай формы навучання — стыпендыю з улікам паспяховасці. Ільготны праезд у транспарце. Ільготны крэдыт для студэнтаў, якія стварылі сям'ю. Адменім плату за праезд дзецям і школьнікам у гарадскім транспарце... (гл. поўны тэкст Праграмы ў інтэрнэце).

**Я гарантую** стварэнне ў краіне эфектыўнай сістэмы правапрымянення і незалежнай судовай сістэмы, пракурорскага нагляду і дзяржкантролю. Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь і Суддзяў усіх узроўняў будзе прызначаць заканадаўчы орган краіны — Парламент, а не Прэзідэнт. Рэалізуем «векавую мару беларусаў — людзьмі звацца!».

**У міжнароднай палітыцы** Беларусь будзе кіравацца мудрым прынцыпам «дакладнейшы падлік — мацнейшае сяброўства» і лозунгам «За моцную, стабільную і квітнеючую Беларусь у Саюзе з брацкай Расіяй, Украінай — сёння, заўтра і на вякі!». Наладзім добрасуседскія адносіны з краінамі Еўрасаюза і іншымі краінамі.

У інтарэсах народа я гатовы да кампрамісаў. Калі Вы выбераце Прэзідэнтам Аляксандра Лукашэнку, я прапаную яму гэту Праграму як стратэгію далейшага развіцця краіны. Але ці прыме ён яе? Не выключана, што пры захаванні яго Сістэмы кіраўніцтва Урад і кіраўнікі прадпрыемстваў акажуцца «хлопчыкамі для біцця» за правалы ў эканоміцы, а народ застанецца падманутым у надзеях.

Калі мы хочам змен, то для гэтага павінны аб'яднаць намаганні.

Хто хоча дапамагчы краіне, давяраючы маёй Праграме, калі ласка, данясіце яе сваім блізкім. Поўны тэкст размешчаны ў інтэрнэце: http://tereshchenko.org.

Дзякуй Вам.

**З павагай,**
**Ваш кандыдат у Прэзідэнты**
**Рэспублікі Беларусь**
**Віктар ЦЯРЭШЧАНКА.**

# ПРЕДВЫБОРНАЯ ПРОГРАММА кандидата в Президенты Республики Беларусь Усса Дмитрия Ивановича



1. Избирательная система Республики Беларусь построена на основе избирательной системы Германии 30-х годов XX века.

**В чем она выражается?**

Выборы проводятся, опираясь на местные исполнительные органы власти. Так, директора школ, предприятий, главврачи поликлиник, больниц заключают контракты с районными исполкомами и администрациями районов. Руководителей вышеуказанных предприятий и организаций обязывают становиться председателями участковых избирательных комиссий. С теми, кто отказывается, не продлевают трудовые контракты. В результате этого руководители попадают в прямую зависимость от местной исполнительной власти, которая диктует, сколько и на каком избирательном участке должно быть голосов за определенного кандидата в протоколе подсчета бюллетеней.

Чтобы этого не произошло на предстоящих президентских выборах, 4 ноября этого года я направил Президенту Республики Беларусь Александру Григорьевичу Лукашенко открытое обращение с предложением срочно внести в Избирательный кодекс Республики Беларусь поправку о том, что:

- каждый кандидат на пост президента Республики Беларусь имеет право направлять в участковые избирательные комиссии своего представителя с полномочиями подсчета бюллетеней и подписывать протокол подсчета бюллетеней.

Без этой поправки не будет объективных выборов в стране.

2. Восстановление отношений с руководством России.

На сегодняшний день Белоруссия несет миллиарды долларов убытков в связи с отказом России от транзитов через территорию нашей страны (автотранзит, транзит газа). Промышленные предприятия нашей республики покупают газ по триста долларов за одну тысячу кубометров, тогда как в 2008 году — по сорок пять долларов за одну тысячу кубометров.

Себестоимость продукции в нашей стране выросла в 2 раза.

Чтобы снизить себестоимость продукции, новому Президенту Республики Беларусь необходимо срочно ехать в Россию для переговоров по восстановлению взаимовыгодных экономических отношений между двумя странами.

Цены на продукты питания на сегодняшний день выше мировых, а зарплаты и пенсии меньше мировых.

**Я предлагаю:**

1. Импортированные продукты питания из стран Западной Европы, стран СНГ не облагать таможенными пошлинами и акцизами. (Например, в Украине летом 1 кг помидоров стоит двести белорусских рублей, при пересечении белорусской границы 1 кг помидоров стоит уже три тысячи рублей. За счет акцизов, таможенной пошлины себестоимость вырастает в 10 раз.)

2. Трудовые пенсии увеличить за счет финансовых средств Управления делами Президента Республики Беларусь. В 1994 году действующим Президентом был издан Указ, согласно которому все прибыльные предприятия, административные здания передаются на баланс Управления делами Президента Республики Беларусь, которое выгодно сдает их в аренду и получает прибыль. Эта прибыль не отражается в бюджете республики и не проверяется налоговыми органами. Сейчас у нас в стране около десяти тысяч таких зданий.

Эти деньги необходимо направить на увеличение пенсий, пособий гражданам нашей страны.

3. Необходимо решать вопрос по капитальному ремонту жилых домов.

Жители проживают в домах по 30-40 лет и платят за техническое обслуживание, а капитальный ремонт не делается. Живут в антисанитарных условиях в аварийных домах. Этот вопрос необходимо решать на государственном уровне.

4. Создать упрощенную систему налогообложения в бизнесе без ограничений по численности работников и независимо от дохода предприятия.

5. Создать благоприятную законодательную базу для привлечения инвестиций в Республику Беларусь, позволяющую предприятиям-инвесторам быть защищенными на государственном уровне. Это будет способствовать созданию рабочих мест с достойной оплатой труда для белорусских граждан.

6. Создавать в стране агропромышленные комплексы по выращиванию и переработке сельскохозяйственной продукции. На базе таких комплексов создавать агрогородки с развитой социальной инфраструктурой, создавать условия для трудоспособного населения, особенно молодежи, достойные условия труда, быта и отдыха.

7. Оказывать государственную поддержку развитию в нашей стране агроэкотуризма, повышать интерес к истории и культуре нашей страны.

8. Восстановить «принцип обратной связи» между законодательной властью и гражданами нашей страны через местные исполнительные органы власти путем выборов последних самими избирателями, а не назначением сверху.

Кватэрнае пытанне

## АБМЕНУ НЕ ПАДЛЯГАЕ

***Мы (маці і дарослы сын) займаем аднапакаёвую кватэру на ўмовах дагавора найму службовага жылога памяшкання. Ці дапускае заканадаўства абмен такой кватэры на 2-пакаёвую непрыватызаваную?***

**А. Горбік,** *Гомельскі р-н.*

Парадак абмену жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду на жылыя памяшканні дзяржаўнага або прыватнага жыллёвага фонду ўстаноўлены Правіламі, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 1999 г. № 1191.

У адпаведнасці з пунктам 9 названых Правілаў абмен жылымі памяшканнямі не дапускаецца, калі, у прыватнасці, жылое памяшканне з'яўляецца службовым, знаходзіцца ў спецыяльным доме або адносіцца да жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Пунктам 75 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносін») таксама вызначана, што службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду не падлягаюць прыватызацыі, абмену, падзелу і здачы па дагаворы паднайму, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Віктар САВІЦКІ.**

# «АБСЕ НЕАБХОДНА ВЫПРАЦАВАЦЬ УНІВЕРСАЛЬНЫЯ СТАНДАРТЫ АЦЭНКІ ВЫБАРАЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь таксама выступае за ўмацаванне ролі АБСЕ ў галіне абароны энергетычнай інфраструктуры, выкарыстання альтэрнатыўных і аднаўляльных крыніц энергіі, у забеспячэнні доступу ўсіх краін да перадавых тэхналогій у гэтай сферы, сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, за 11 гадоў пасля Стамбульскага саміту адбыліся кардынальныя змяненні ў нашым рэгіёне, у глабальным маштабе. Свет сутыкнуўся з шэрагам новых выклікаў і пагроз, прынцыпова іншай стала геапалітычная канфігурацыя ў Еўропе.

«Я ўдзельнік усіх трох саміту АБСЕ. На папярэдніх, думаю, і на гэтым, мы прымалі і прымем добрыя рашэнні. І як бы мы ні гаварылі аб значнасці нашай работы, у яе актыў сёння запісаць нам, на жаль, няма чаго. Наўрад ці трэба на гэтым этапе гаварыць, хто вінаваты. Трэба гаварыць, што рабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што агульным інтарэсам адпавядае моцная агульнаеўрапейская архітэктура стабільнасці і бяспекі на аснове шырокага кансэнсусу, сапраўднай салідарнасці, партнёрства і ўзаемнай павагі. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што АБСЕ можа і павінна адыграць ключавую ролю ў фарміраванні такой супольнасці бяспекі і стабільнасці. «Каб справіцца з гэтай задачай, сама арганізацыя мае патрэбу ў вельмі сур'ёзнай мадэрнізацыі», — дадаў Прэзідэнт.

«Мы перакананы ў неабходнасці прыняцця Статута і ператварэння АБСЕ ў паўнацэнную міжнародную арганізацыю. Інакш многія з прапаноў аб новых задачах арганізацыі, якія прагучалі ўчора і сёння, застануцца вісець у паветры, як і папярэднія, — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Лічым важнымі далейшыя захады па выпраўленні функцыянальных і геаграфічных перакосаў у рабоце нашай арганізацыі».

Паводле яго слоў, трэба актывізаваць работу над удасканаленнем дзейнага інструментарыя АБСЕ ў галіне ўмацавання даверу і бяспекі. Адна з прыярытэтных задач — абнаўленне Венскага дакумента 1999 года. Беларусь прадставіла сваю комплексную прапанову па гэтым пытанні і разлічвае на яе падтрымку, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы паслядоўна выступаем за стварэнне ў зоне адказнасці нашай арганізацыі адзінай сістэмы бяспекі. Гэта дапамагло б даць усім удзельнікам дакладныя і роўныя гарантыі ў названай галіне, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — У прыватнасці, лічым, што ядзерныя дзяржавы — удзельніцы АБСЕ маглі б ужо сёння даць няядзерным краінам-удзельніцам безумоўныя і недвухсэнсоўныя гарантыі бяспекі, суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці. Учора Беларусь і Злучаныя Штаты прынялі тут, у Астане, сумесную заяву аб сумесных мерах па прадухіленні ядзернага распаўсюджвання, пацвердзіўшы, у тым ліку, ужо існуючыя элементы гарантый. Гэта важны і канкрэтны ўклад у агульную справу стварэння бяспечнай Еўропы і свету».

Беларусь зацікаўлена ў мірным вырашэнні канфлікту ў Грузіі.

«Мы абсалютна мірныя людзі, мы хацелі б, каб нашы браты ў Грузіі — мы ж жылі ў адной дзяржаве, і расіяне, і грузіны — усё-такі знайшлі мірнае вырашэнне гэтага канфлікту, каб гэтая сітуацыя нарэшце супакоілася», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што гэты канфлікт не дабаўляе стабільнасці на Каўказе, і Беларусь хацела б, каб там людзі жылі дастойна, «як гэтага заслугоўваюць».

Што датычыцца перспектыў прыняцця падагульняючага дакумента саміту АБСЕ ў Астане і таго, як на яго прыняцці могуць адбіцца рознагалоссі Расіі і Грузіі (пазіцыі ў АБСЕ прымаюцца на аснове кансэнсусу. — **Заўвага БЕЛТА**), Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтым пытанні «трэба будзе шукаць кампрамісы». Паводле яго слоў, ёсць некалькі вострых момантаў, у тым ліку і грузінская тэма. «Калі кампрамісы не знойдзем, то і дакумент не прымем. Таму мне здаецца, што тут трэба будзе яшчэ працаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што напружаная работа прадаўжаецца як на ўзроўні экспертаў, так і кіраўнікоў дзяржаў.

Процідзеянне гандлю людзьмі павінна заставацца адным з ключавых прыярытэтаў АБСЕ ў гуманітарнай сферы, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Сярод ключавых прыярытэтаў арганізацыі ў гуманітарнай сферы павінна заставацца процідзеянне гандлю людзьмі — адзін з важнейшых аспектаў абароны рэальных правоў чалавека», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ініцыятывы Беларусі па гэтым пытанні ў ААН добра вядомы. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, АБСЕ, маючы даволі сур'ёзны экспертны і арганізацыйны патэнцыял, магла б унесці больш істотны ўклад у рэалізацыю Глабальнага плана дзеянняў ААН у гэтай сферы. «Перакананы, што сумеснымі намаганнямі мы зможам вывесці барацьбу з рабствам XXI стагоддзя на якасна новы ўзровень», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Хачу яшчэ раз паўтарыць, што для Рэспублікі Беларусь АБСЕ застаецца адной з ключавых арганізацый у сферы бяспекі на еўраатлантычнай прасторы і ў стварэнні зоны стабільнасці і ўстойлівага развіцця ў рэгіёне адказнасці. Беларусь не на словах, а на справе працуе над тым, каб ўзмацніць практычны багаж бяспекі і захавання інтарэсаў грамадзян нашых дзяржаў — ад ядзернага нераспаўсюджвання да абароны гуманітарных правоў. Мы гатовы і далей аб'ядноўваць свае намаганні на гэтых напрамках з усімі партнёрамі ў АБСЕ», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

Дэлегаты Усебеларускага сходу

## БУДАЎНІЦТВА — ПА ЕЎРАПЕЙСКІХ СТАНДАРТАХ

**По будаўніцтве жылля на аднаго чалавека Беларусь займае першае месца на пост-савецкай прасторы. Калі ў Гомельскай вобласці за 2006 год было здадзена 524 тысячы метраў квадратных жылой плошчы, то сёлета вобласць выходзіць на 960 тысяч. З іх 210 тысяч метраў квадратных жылля — уклад працоўнага калектыву Гомельскага домабудаўнічага камбіната, які ўзначальвае Уладзімір ГАРБАЧОЎ. Генеральны дырэктар гэтага прадпрыемства — сярод 350 прадстаўнікоў Гомельшчыны на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе:**

— Усебеларускі народны сход — гэта аптымальнае спалучэнне гістарычнага вопыту і сучасных прынцыпаў народаўладства. У нашым сучасным жыцці прынцып адкрытай і сумленнай размовы з людзьмі асноватворны. Для жыхароў Гомельшчыны далёка не абыякавы накірунак, па якім будзе ісці эканамічнае і сацыяльнае развіццё краіны. Гэта пацвярджае і тая актыўнасць, з якой супрацоўнікі Гомельскага домабудаўнічага камбіната ўключыліся ў абмеркаванне асноўных палажэнняў праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на бліжэйшую пяцігодку. Жыллёвае будаўніцтва было вызначана адным з прыярытэтаў у Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі на 2006-2010 гады. Гомельскі домабудаўнічы камбінат быў уключаны ў дзяржаўную комплексную праграму развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны. На камбінаце ідзе тэхнічнае пераўзбраенне, рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты. Вынікам стала абнаўленне вытворчых магутнасцяў. Гэты год быў годам якасці. Гэта тычыцца і паляпшэння якасці жылля. Мадэрнізацыя дазволіла знізіць выдаткі вытворчасці, павялічыць прадукцыйнасць працы, а таксама значна палепшыць спажывецкія якасці кватэр, якія цяпер адпавядаюць усім сучасным нормам і патрабаванням. Новыя ўдасканаленыя жалезабетонныя канструкцыі дазваляюць узводзіць жыллё з больш высокімі характарыстыкамі па цэлым шэрагу параметраў — перш за ўсё па энергазберажэнні.

Мы працягваем мадэрнізацыю вытворчасці. Наша мэта — стварэнне ў Гомелі завода, які адпавядае самым высокім еўрапейскім стандартам. Нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці вядзе да павялічэння колькасці працоўных. Сёння ў калектыве працуе амаль 4000 чалавек. За апошні год іх колькасць павялічылася практычна на 400. Гэтыя людзі ўмеюць не толькі добра працаваць, але і адпачываць, займаюцца фізкультурай і мастацкай самадзейнасцю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# РЭКЛАМАДАЎЦАЎ ПРЫМУСЯЦЬ БЫЦЬ СУМЛЕННЫМІ СА СПАЖЫЎЦАМІ

**Калі ў рэкламнай аб'яве вам гарантуюць стопрацэнтнае вылечванне ад алкагалізму ці пазбаўленне ад тытунёвай залежнасці ўжо пасля трох сеансаў, майце на ўвазе, што вы маеце справу з нядобрасумленнай рэкламай. Аднак як у такім разе рэкламадаўцы адважваюцца на надзвычай «смелыя» абяцанні, бо тэкст рэкламы медыцынскіх паслуг павінен абавязкова ўзгадняцца з Міністэрствам аховы здароўя?**

— Заказчыкі рэкламы яго і сапраўды ўзгаднялі, — тлумачыць **кансультант упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК**. — Аднак ужо пасля ўзгаднення дапоўнілі свае макеты іншай інфармацыяй, якая ўтрымлівала нічым не пацверджаныя абяцанні. Мелі справу мы і з выпадкам нядобрасумленнай канкурэнцыі, калі на сайце аднаго з суб'ектаў гаспадарання, які аказвае насельніцтву медыцынскія паслугі, паведамлялася, што абсталяванне, якое яны выкарыстоўваюць, лепшае, чым у канкурэнтаў. Згодна з дзейным заканадаўствам забараняецца параўноўваць тавар, працу ці паслугу, якія рэкламуюцца, з таварам, працай ці паслугамі іншых арганізацый.

Менавіта на Міністэрства гандлю ўскладзена задача па кантролі за выкананнем рэкламнага заканадаўства. Скажам, калі рэкламадаўца сцвярджае, што яго прадукт ці тавар — лепшыя ў краіне, яго могуць аштрафаваць. Увогуле з выкарыстаннем слоў у найвышэйшай ступені ці іншых слоў, якія ствараюць у спажыўца ўражанне пра перавагу аднаго тавару перад іншымі, трэба быць асабліва асцярожнымі. Інакш вас могуць папрасіць пацвердзіць гэта дакументальна.

У Міністэрстве гандлю не хаваюць, што нярэдка даказаць неэтычнасць ці нядобрасумленнасць рэкламы бывае зусім не проста. Даводзіцца прыцягваць да экспертызы работнікаў інстытутаў філасофіі, эканомікі, мовазнаўства Акадэміі навук, звяртацца ў Міністэрства культуры ці да грамадскіх арганізацый.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**

**По выніках правядзення тэматычных маніторынгаў рэкламнага рынку Міністэрствам гандлю ў 2010 годзе былі вынесены 272 прадпісанні і складзена 50 пратаколаў. Недакладнай рэкламу прызналі ў 7 выпадках, нядобрасумленнай — у 20, неэтычнай — у 8.**

**У рэкламе лекавых сродкаў было ўстаноўлена 10 парушэнняў Закона «Аб рэкламе».**

**У рэкламе алкагольных напіткаў было выяўлена 7 парушэнняў і ў рэкламе піва — 3.**

**Сума штрафных санкцый за парушэнні рэкламнага заканадаўства склала 28 мільёнаў рублёў.**

